**УДК 904(476)**

# ПАПЯРЭДНІЯ ВЫНІКІ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ "ХРАМА НА ДЗЯДЗІНЦЫ" XII СТ. У ПОЛАЦКУ Ў 2019-2021 ГГ.[1]

***І.У. Магалінскі, А.Л. Коц***
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай, Полацк, Рэспубліка Беларусь

***П.М. Кенько***
Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск, Рэспубліка Беларусь

*У артыкуле прадстаўлены папярэднія вынікі даследавання "храма на дядзінцы" XII ст., які быў паўторна выяўлены падчас археалагічных работ 2019-2021 гг. на тэрыторыі Вехняга замка Полацка. У выніку работ устаноўлена, што ніжнія часткі сцен і падмурак цэнтральнай часткі храма добра захаваліся. Падчас даследаванняў былі ўдакладнены памеры пабудовы, засведчаны асобныя будаўнічыя прыёмы, вызначаны архітэктурныя дэталі, устаноўлены асаблівасці вытворчасці плінфы, а таксама праведзена прывязка аб'екта на мясцовасці.*

***Ключавыя словы:*** *архітэктурная археалогія, манументальнае дойлідства, полацкая школа дойлідства, Верхні замак, Полацк, храм на дздзінцы.*

**Уводзіны.** Рэканструкцыя былых карпусоў гарадской бальніцы на Верхнім замку Полацка пад кадэцкае вучылішча дала магчымасць усебаковага вывучэння культурнага слою ў межах дадзенай часткі старажытнай гарадской тэрыторыі.

Падчас зносу часткі гаспадарчых будынкаў у межах былога бальнічнага гарадка ў лістападзе-снежні 2019 г. былі часткова раскрыты падмуркі храма XII ст., які ў літаратуры вядомы як "храм на дзядзінцы", "храм на Верхнім замку", "царква Архангела Міхаіла", "Міхайлаўская царква" і інш. [2, с. 209]. Помнік быў выяўлены пад час будаўніцтва падвала бальнічнага морга і часткова даследаваўся ў 1966-1967 гг. М.К. Каргерам.

Акрамя паўночнай часткі храма невялікім раскопам даследавана ўсходняя частка паўднёвай сцяны, шурфы таксама былі закладзены на іншых участках сцен і на месцы паўночна-ўсходняга падкупальнага слупа. Усе атрыманыя звесткі дазволілі вызначыць, што тут знаходзіўся вялікі трохнэфавы шасціслуповы храм. М.К. Каргер зрабіў выснову, што цэнтральная частка помніка была цалкам знішчана познімі пабудовамі [1, с. 203].

У 2020 г. атрымалася раскрыць паўночную сцяну апсіды (мал. 2), правесці шурфоўкі (шурф 1) паўднёва-ўсходняга падкупальнага слупа і закласці траншэю (траншэя 1) на месцы паўднёвай сцяны прытвора (мал. 3). Таксама быў лакалізаваны паўднёва-заходні падкупальны слуп. Пляма зачысткі архітэктурных канструкцый апсіды дасягала 6,0х1,6 м, памер траншэі 1 – 9,0х1,0 м з прырэзкай на поўдзень 1,0х0,5 м, а шурфа 1 – 2,0х1,0 м.

**Асноўная частка.** Падмуркі і ніжнія часткі сцен храма размешчаны на поўнач ад былога тубдыспансера на адлегласці 5-7 метраў ад паўночнай сцяны будынка (мал. 1:2). Паўночная сцяна помніка размяшчаецца на адлегласці да 20 м ад паўднёвай сцяны былога скурна-венералагічнага дыспансера.

Даследаванні кладкі пабудовы дазволілі ўстанавіць, што храм складзены з плінфы у тэхніцы "са схаваным радам". У заходняй сцяне пабудовы тры ніжнія шэрагі пакладзены без схаванага рада. Пры гэтым выкарыстоўваліся не толькі цэлыя плінфы, але і кавалкі. Забутоўка камянямі сцен, як гэта вызначае М.К. Каргер, не зафіксавана [1, с. 203]. Таўшчыня швоў, дзе яна фіксавалася, розная. У пераважнай большасці швы маюць таўшчыню каля 3 см, але ў асобных выпадках яны могуць дасягаць 4,5 см і нават 5,5 см. У траншэі 1 вызначана, што ў пераважнай большасці швы ў прытворы і ў заходняй сцяне храма маюць таўшчыню не больш за 3-3,5 см.

Раскопкі падмуркаў храма не праводзіліся. Пацверджана, што падмуркі царквы складзены з валуноў без выкарыстання рошчыны. На апсідзе вызначана, што ніжнія камяні падмурка ўпаяны ў ніжнія рады кладкі, то бок выраўнівання паверхні падмурка і адзінай заліўкі, магчыма, не было.

Падчас даследаванняў была раскрыта паўночная частка сцяны апсіды і расчышчаны яе контур з боку інтэр'ера. Фасад апсіды быў зафіксаваны толькі ў адным месцы, з паўночна-ўсходняга боку. Таўшчыня сцяны тут складае 1,28-1,29 м. Унутраная шырыня апсіды з боку наоса паміж крайнімі заходнімі кропкамі дасягае 5,75 м, а даўжыня ў інтэр'еры складае 4,87 м. Выяўленне апсіды дазваляе ўдакладніць даўжыню асноўнага аб'ёма храма ў інтэр'еры – каля 21,20-21,25 м. Такім чынам, агульная даўжыня пабудовы па знешніх контурах (з улікам прытвора) прыблізна роўная 30,5 м (мал. 1:1).

Таксама вызначана, што магутнасць усходняй сцяны (паўночнага ўчастка) пацвярджае наяўнасць у яе тоўшчы ахвярніка. Яе таўшчыня ў месцы змыкання са сцяной апсіды дасягае 2,0 м. Магутнасць паўночнай часткі сцяны апсіды пры змыканні з паўднёвай часткай сцяны ахвярніка дасягае 1,2 м.

На апсідзе захавалася да 10 радоў плінфы (5 пар радоў). На ўсходняй сцяне храма (паўночная частка) зафіксавана да 14 радоў плінфы, але яны пашкоджаны заліўкай падмурка ў савецкі час і, магчыма, былі знішчаны пры яго разбурэнні ў межах добраўпарадкавання, што было зроблена ўжо пасля кансервацыі рэштак храма ў 2021 г. Апсіда, як і іншыя часткі храма, узведзена ў сістэме схаванага раду. Кладка плінфы ў схеме тычок-лажок не вызначана.

У траншэі 1 зафіксавана заходняя сцяна царквы і часткова паўднёвая сцяна прытвора. Заходняя сцяна асноўнага аб'ёма мае таўшчыню 1,47 м. Яна захавалася на вышыню 11 радоў плінфы (да 0,7-0,8 м). Пры заходняй сцяне, з боку інтэр'ера быў выяўлены фрагмент падрыхтоўкі пад падлогу. Памер фрагменту пляцоўкі дасягаў 0,8х0,8 м. Яна ўшчыльную прымыкала да сцяны храма і закрывала 8 ніжніх радоў кладкі. Верхняя зафіксавана на ўзроўні 133,71 (па балтыйскай шкале), але знешняй паверхні падлогі не выяўлена. Падрыхтоўка пад падлогу знаходзілася на чорным культурным пласце і складаецца са слою дробназярністага пяску перамяшанага з шэрым культурным пластом і слою дробназярністай пясчанай падсыпкі, якая перакрыта слоем вапнавай рошчыны.

[1] Артыкул падрыхтаваны ў межах Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» на 2021–2025 гг. (падпраграма «Гісторыя», заданне «Археалагічная спадчына як фактар забеспячэння гуманітарнай бяспекі беларускага грамадства», праект «Гаспадарка, культурныя традыцыі і насельніцтва Полацка і Полацкага Падзвіння ў эпоху станаўлення і развіцця гістарычных форм беларускай дзяржаўнасці ў IX–XVIII стст.», нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20211489 ад 21.05.2021)."

Раскопкі паўднёвай сцяны прытвора дазволілі вызначыць некаторыя дэталі. Даўжыня ўнутранага аб'ёма прытвора складае 4,36-4,4 м. Вышыня кладкі налічвае да 9 радоў плінфы (0,6-0,7 м). Вышыня заходняй сцяны прытвора складае 6 радоў плінфы. Заходні фасад прытвора моцна пашкоджаны і знешняй паверхні у межах траншэі 1 не вызначана. Таўшчыня паўднёвай сцяны складае каля 1 м. Першыя тры рады кладкі ўнутранай паверхні сцяны інтэр'ера пакладзены без перавязкі. Вышэй усе схаваныя шэрагі і асобныя вонкавыя рады маюць перавязку.

У межах шурфа 1 лакалізаваны паўднёва-ўсходні падкупальны слуп. Вызначана, што ён значна пашкоджаны бетоннай канструкцыяй падмурка гаспадарчай пабудовы другой паловы XX ст. Была расчышчана толькі ўсходняя частка слупа без значнага заглыблення ў культурны пласт. Слуп меў крыжападобную форму ў ніжняй частцы. Тая ж форма зафіксавана і ў паўднёва-заходнім слупе.

Археалагічныя знаходкі з даследаванняў храма ў пераважнай большасці прадстаўлены будаўнічымі матэрыяламі: калекцыяй плінфы, у тым ліку лекальнай формы, пліткамі падлогі, злепкамі вапнавай рошчыны-цамянкі, якія паходзяць з міжплінфяных швоў, фрагментамі тынкоўкі з фрэскавым жывапісам і інш.

Пераважная большасць плінфы, якая выяўлена па-за межамі кладак, захавалася ў фрагментах. Сабрана вялікая калекцыя старажытнай цэглы і на момант публікацыі апрацаваны больш чым 200 артэфактаў. Пераважная большасць знаходак паходзіць з даследаванняў як самога храма, так і з плямы разбурэння, якая распаўсюджвалася на ўсход, поўдзень і асабліва на захад ад помніка.

Аналіз шырыні плінфы праведзены для 46 экземпляраў. Зафіксавана, што большасць вырабаў мае шырыню 19,5-21,0 см. Больш дробнага фармату плінфа мае шырыню 17,5-18,5 см. Шырыня дробнафарматнай плінфы – 14,0-15,0 см. Пераважная большасць плінфы мае таўшчыню ў дыяпазоне ад 3,2-3,3 да 4,0 см.

Большасць лекальнай плінфы знойдзена ў выглядзе фрагментаў. Сабраны шэраг дробнафарматнай плінфы з адным скругленым бокам. Яе памер ?х15-15,5х3,0-4,0 см. Акруглы бок сплошчаны, прыблізны радыус закруглення - каля 8 см. Сабрана значная колькасць фрагментаў трохкутнай плінфы, дзе адзін бок скруглены. Трапецыяпадобныя плінфы маглі выкарыстоўвацца для выкладкі акруглых архітэктурных форм. Рэканструкцыя гэтай формы плінфы вызначае іх памер у межах 20 см – вялікая аснова, 32,5 см – бакі, 13,5 см – меньшая аснова. Таксама знойдзена плінфа для ўзвядзення карнізаў на фасадзе: прамакутнай формы, дзе адзін бок мае дзве грані (кшталту трохкутніка) (мал. 4:2). Яе памер 25 (максімальная даўжыня)х9-10х3,5 см. Цікава, што на адной плінфе захаваўся адбітак з трох зубцоў (мал. 4:1). Іншая лекальная плінфа прадстаўлена фрагментамі адзіночных знаходак.

Таксама было зафіксавана шмат рэльефных выяў на тарцах плінфы, якія варта называць знакамі. Найбольш вядомы і папулярны знак Трызуба выяўлены ў двух варыяцыях (мал. 4:3, 4:5). Першы варыянт выяўлены ў трох экземплярах. Аналагічныя выявы былі знойдзены пад час даследаванняў 1967 г. [3, ](мал. 4:4). Таксама фіксуецца некалькі выяў, блізкія па форме да салярнай сімволікі (мал. 4:6) і знак у выглядзе перакрыжавання ліній у квадраце. Іншыя знакі на тарцах нельга дакладна ахарактарызаваць як пэўныя фігуры. Таксама знойдзены адзін фрагмент плінфы з выявай знака на ніжняй пастэлі плінфы. Ён мае блізкае падабенства з літарай грэчаскага алфавіту "Тау". Літара мае рэльефную выяву, але зроблена дастаткова змазанай і дрэнна чытаецца. Малюнкаў на пастэлях выяўлена не было, але асобныя прамаляваныя лініі і рыскі на фрагментах плінфы сведчаць, што пад час узвядзенне гэтага храма, майстры таксама шырока выкарыстоўвалі свежую плінфу, як матэрыял прыдатны для пісьма і малявання.

Па археалагічных раскопках 1967 г. вядома, што храм на дзядзінцы быў аздоблены падлогай з плітак. У часе даследаванняў апошніх гадоў пліткі падлогі былі выяўлены толькі ў межах вывучэння прасторы храма. Пераважная большасць артэфактаў зафіксавана ў траншэі 1. Усе яны захоўваліся ў пераадкладзеным пласце і не мелі лакалізацыі in situ. Усяго пад час даследаванняў зафіксвана 14 фрагментаў плітак падлогі.

Адна група плітак з 2-х знаходак мае трохкутную форму. Другую групу можна акрэсліць як прамакутныя пліткі. У некалькіх плітак можна рэканструяваць квадратную форму з бокам больш 11,5 см. 10 экземпляроў з'яўляюцца невялікімі фрагментамі і ў іх немагчыма вызначыць форму. Разнастайнасць паліваў сягае двух колераў: жоўтыя і зялёныя пліткі. Колер выяўлены толькі на 11 вырабах, з якіх тры пакрыты зялёнай палівай, а 8 - жоўтай.

Пад час даследаванняў храма і слою будаўнічага смецця, сфарміраванага пра разбурэнні царквы, сабрана невялікая калекцыя фрагментаў жывапісу. Пераважная большасць фрагментаў мае памер не больш чым 3х3 см. У большасці фрагменты маюць зялёны і чырвоны фонавы колер. Фрагментаў жывапісу на сценах (у ніжніх частках, дзе адбывалася раскрыццё кладкі ад культурнага слоя) не выяўлена.

**Заключэнне.** Такім чынам, падчас апошніх археалагічных даследаванняў падмуркаў храма на дзядзінцы, які размяшчаецца на тэрыторыі Верхняга замка Полацка, устаноўлена, што ніжнія часткі сцен і падмурак цэнтральнай часткі помніка добра захаваліся. У выніку прац былі ўдакладнены памеры пабудовы, засведчаны асобныя будаўнічыя прыёмы, вызначаны архітэктурныя дэталі, устаноўлены асаблівасці вытворчасці плінфы, а таксама праведзена прывязка аб'екта на мясцовасці.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Каргер, М.К. К истории Полоцкого зодчества XII в. (руины вновь открытого храма на Верхнем замке) / М.К. Каргер // Новое в археологии. – Москва: МГУ. – 1972. – с. 202-209.
2. Тарасаў, С.В. Полацкі княжацкі храм. / С.В. Тарасаў // Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. У 2 т. Т.2. Л-Я / рэдкал.: Т.У. Бялова і інш. -Мінск: Беарус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. - с. . 209.
3. Хозеров, И.М. Белорусское и Смоленское злдчество XI—XII вв. / И.М. Хозеров. - Минск: Наука и техника, 1994. - 151 с.


## PRELIMINARY RESULTS OF THE ARCHAEOLOGICAL RESEARCH THE CHURCH ON DZYADZINTS OF XII CENTURY IN POLOTSK IN 2019-2021

*I. Magalinsky, A. Kots, P. Kenko*

*The church on dzyadzints of ancient Polotsk is a well-known object among similar monuments. The construction organization carried out reconstruction the buildings of the city hospital in 2019-2021. The builders restored part of the buildings,*

*and the outbuildings were demolished. The researchers conducted a scientific study of the remains of the temple, which was covered by farm buildings in the 20th century. During the archaeological excavations, archaeologists determined: the lower parts of the walls and the foundations of the central part of the monument are well preserved, the dimensions of the building, individual construction methods and architectural details, the peculiarities of the production of the plinth. Scientists made the exact localization of the architectural monument in the area.*

***Keywords:*** *architectural archaeology, monumental architecture, Polotsk school of architecture, Upper Castle, Polotsk, hurch on dzyadzints.*




**Малюнак 1. – 1) План храма (паводле М.К. Каргера) з дапаўненнямі па выніках даследаванняў 2019-2021 гг.; 2) Месца лакалізацыі помніка ў межах ажыццяўляемага праэкта рэканструкцыі будынкаў бальніцы**



**Малюнак 2. – Агульны выгляд працэсу раскопак апсіды храма**



**Малюнак 3. – Даследаванні ў траншэі 1. На пярэднім плане фрагмент падрыхтоўкі пад падлогу, заходняя сцяна храма і прымыкаючая да яе сцяна прытвора**




**Малюнак 4. – 1) Плінфа з адбіткам “носікаў”лекальных цаглін; 2) Лекальная плінфа; 3), 5) Знакі трызубцаў на тарцах плінфы; 4) Знак трызубца з даследаванняў храма М.К. Каргера; 6) Знак з салярнай сімволікай**